

ТУРЫЗМ, АПК, РАЗВІЦЦЁ ТЭРЫТОРЫЙ

МС



ЯКІЯ ПРЫШЧЭПКІ ВАРТА ЗРАБІЦЬ ВОСЕННЮ?

12


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ВЕРАСНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 187 (30067)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ШВЕЦ, першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Будаўнічая галіна справілася з усімі выклікамі, якія сталі перад ёй. Тэмпы экспарту за апошнія гады не апускаліся ніжэй за 100 працэнтаў. У прыватнасці, экспарт будаўнічых тавараў у Расію з пачатку года вырас на 24 працэнты — не толькі ў грашовым выражэнні, але і ў аб'ёме. Мы таксама адкрываем новыя краіны і рынкі. Можна сказаць, што ўсе негатыўныя тэндэнцыі мы пераадолелі і вырашылі ўсе пытанні. Мы ідзём наперад — развіваемся, забяспечваем кааперацыю, унутраны рынак, пастаўкі на экспарт. Беларусь пастаўляе прадукцыю і паслугі ў Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Кітай. Геаграфія пашыраецца. Ужо ёсць новыя напрацоўкі».*

# Шыкоўныя краскі восені



Фота БелТА.

**У Цэнтральным батанічным садзе Нацыянальнай акадэміі навук — час шыкоўных колераў і кветак: красуюць хрызантэмы і вяргіні. Кветкі сапраўды шыкоўныя, бо растуць у доглядзе, пад апекай дасведчаных спецыялістаў. Напрыклад, Вольга ДУБРОВА, навуковы супрацоўнік лабараторыі інтрадукцыі і селекцыі арнаментальных раслін, курыруе калекцыю вяргінь.**

## КОРАТКА

• **Бясплатныя прававыя кансультацыі да Дня пажылых людзей пройдуць у Беларусі.**

• Беларусь далучылася да папраўкі да Канвенцыі аб фізічнай абароне ядзернага матэрыялу.

• **У Беларусі намалочана больш за 246 тыс. тон зерня кукурузы.**

• Аб'ём экспарту турыстычных паслуг за сем месяцаў перавысіў $116 млн.

• **Палова экспарту арганізацый «Беллеспаперапрама» прыпадае на Расію.**

ISSN 1990 — 763X

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ!

# Грыбны «квэст»

### Што варта прадугледзець, ідучы ў лес?

**Ціхае паляванне — у самым разгары. А значыць, усё больш становіцца грыбнікоў, якія не могуць самастойна выбрацца з лесу і вярнуцца дахаты. Прычым губляюцца не толькі грыбнікі-навічкі, а і тыя, хто збірае лясныя дары на працягу дзясяткаў гадоў. І гэта звязана не толькі з тым, што лес мяняецца, — зарастаюць даўно знаёмыя сцяжынкі, а добра вядомы шлях перакрывае паваленае дрэва. Нярэдка грыбнікі пераацэньваюць свае сілы і ў пошуках лісічак ды баравікоў пераадольваюць вялікія адлегласці. Вярнуцца назад не дазваляе здароўе. Іншыя, упэўненыя ў сваіх сілах, будучы ў лесе, не звяртаюць увагі на арыенціры — у выніку заблукаюць у незнаёмыя месцы.**

СТАР. 3




Вялікі перапынак

# СТАЦЬ ФЕРЗЁМ У СВАЁЙ ПРАФЕСІІ

### Ва ўдзельнікаў фестывалю «Педагагічны дэбют» свая формула поспеху



**Мноства пытанняў паўстае перад кожным маладым педагогам. З чаго пачаць? Што сказаць вучням ці выхаванцам пры першай сустрэчы? Як выбудаваць узаемадносіны з дзіцячым калектывам і знайсці падыход да кожнага? Як зрабіць бацькоў дзяцей сваімі саюзнікамі? Як прызвычаіцца да новай сваёй ролі? Яны баяцца, што вучні не будуць успрымаць іх усур'ёз, баяцца аказацца з дзецьмі на розных хвалях, не ведаюць, як прымуць іх старэйшыя калегі.**

СТАР. 5